## ***Ушанаванне памяці М. Багдановіча***

| | |
|---|---|
| **1917** | ***28 мая*** ў газеце «Вольная Беларусь» апублікаваны некралог пад назвай «М. Багдановіч», напісаны З. Бядулем. У некралогу аўтар дае высокую ацэнку паэтычнай спадчыне М. Багдановіча і паказвае яе значэнне для беларускага нацыянальнага адраджэння, адзначае, якую страту панесла беларуская літаратура і бацькаўшчына са смерцю паэта.<br>*Бядуля, З. М. А. Багдановіч : [некралог] / З. Бядуля // Вольная Беларусь. – 1917. – 28 мая. – С. 1.* |
| **1918** | ***26 мая*** у газеце «Вольная Беларусь» апублікаваны артыкул З. Бядулі «У гадаўшчыну», прысвечаны памяці М. Багдановіча (1891–1917).<br>*Бядуля, З. У гадаўшчыну / З. Бядуля // Вольная Беларусь. – 1918. – 26 мая. – С. 1–2.* |
| **1922** | ***3 снежня*** ў Беларускім дзяржаўным універсітэце адбыўся ***вечар памяці*** М. Багдановіча, у якім удзельнічалі рэктар універсітэта У.І. Пічэта, прафесар М.М. Піятуховіч, беларускі драматург У. Галубок, старшыня Цэнтральнага беларускага саюза Я.Л. Дыла.<br>*Івашын, І. Беларуская культура. Вечар памяці беларускага песняра Максіма Багдановіча / І. Івашын // Савецкая Беларусь. – 1922. – 6 снеж. – С. 3.* |
| **1923** | Бацька паэта А. Багдановіч перадаў Інстытуту беларускай культуры значную колькасць рукапісаў М. Багдановіча, якія ўдалося выратаваць ад пажару ў Яраслаўлі ў 1918 г. Многія рукапісы былі змешчаны ў акадэмічным выданні твораў пісьменніка.<br>*Бэндэ, Л. З неапублікаванага / Л. Бэндэ // Літаратура і мастацтва. – 1957. – 25 мая. – С. 2.*<br><br>***16 чэрвеня*** ў Мінску ў Доме працаўнікоў асветы адбыўся ***вечар памяці*** М. Багдановіча з удзелам бацькі паэта А. Багдановіча, старшыні Інстытута беларускай культуры С.М. Некрашэвіча, прафесара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта М.М. Піятуховіча, рэктара, прафесара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта У.І. Пічэта і інш.<br>*1. Хроніка беларускай культуры // Полымя. – 1923. – № 5–6. – С. 156–158.*<br>*2. Бабарэка, А. Вечар памяці Максіма Багдановіча / А. Бабарэка // Савецкая Беларусь. – 1923. – 20 чэрв. – С. 4.*<br>*3. Бядуля, З. Мае ўспаміны. (К вечару памяці М. Багдановіча) / З. Бядуля // Савецкая Беларусь. – 1923. – 16 чэрв. – С. 3.* |
| **1924** | У ***жніўні*** па даручэнні Інстытута беларускай культуры група маладых пісьменнікаў (У. Дубоўка, А. Ажгірэй, А. Александровіч) ***адшукала магілу*** М. Багдановіча, якая аказалася разбуранай і размытай.<br>***У верасні*** Цэнтральным выканаўчым камітэтам БССР было выдзелена 250 р. на ***ўпарадкаванне магілы М. Багдановіча.***<br>Увосень на ялцінскіх могілках з’явіўся ***бетонны абеліск*** з надпісам:<br>Хоць зернейкі засохшымі былі,<br>Усё ж такі жыцьцёвая іх сіла<br>Збудзілася і буйна ўскаласіла |

| | |
|---|---|
| | Парой вясенняй збожжа на ральлі.<br>*1. Магіла Максіма Багдановіча // Сялянская праўда. – 1924. – 3 кастр. – С. 3.*<br>*2. Дубоўка, У. На Багдановічавай магілцы / У. Дубоўка // Узвышша. – 1927. – № 2. – С. 157–159.*<br>*3. Зубараў, Л. Васількі на магіле паэта // Вячэрні Мінск. – 1989. – 13 мая. – С. 3.* |
| **1927–1928** | Акадэмія навук БССР выдала ***збор твораў*** М. Багдановіча ў двух тамах. |
| **1929** | На Украіне М. Драй-Хмарам выдадзены ***зборнік «Вянок»*** у перакладзе на ўкраінскую мову<br>*Лойка, А. Вянок сяброўства / А. Лойка // Літаратура і мастацтва. – 1968. – 23 студз. – С. 3.* |
| **1947** | У Гомельскім педагагічным інстытуце адбылося ўрачыстае ***пасяджэнне кафедры беларускай літаратуры***, прысвечанае 30-годдзю з дня смерці М. Багдановіча, на якім выступіў дацэнт С. Васілёнак. Гомельская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна арганізавала ***літаратурную выстаўку***. Гэта дата святкавалася ў многіх школах Гомеля і Гомельскай вобласці.<br>*Васілёнак, С. Палымяны пясняр. С. Васілёнак // Літаратура і мастацтва. – 1947. – 24 мая. – С. 3.* |
| **1957** | ***24 мая*** ў сувязі з 40-годдзем з дня смерці паэта ўказам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 44-й сярэдняй школе г. Мінска і Смалявіцкай раённай бібліятэцы (Мінская вобл.) ***было прысвоена імя Максіма Багдановіча***.<br>*О присвоении 44-й школе гор. Минска и Смолевичской районной библиотеке имени Максима Богдановича : указ Президиума Верховного Совета БССР // Советская Белоруссия. – 1957. – 25 мая. – С. 3.*<br><br>***25 мая*** ў парку санаторыя «Беларусь» у Верхнім Місхоры (непадалёку ад Ялты) быў ***адкрыты помнік – бронзавы бюст М. Багдановічу*** (скульптар Заір Азгур). Мерапрыемства прымеркавана да 40-годдзя з дня смерці паэта. У ім удзельнічалі беларускія пісьменнікі І. Мележ, М. Аўрамчык, украінскія пісьменнікі.<br>*1. Памятник Максиму Богдановичу в Крыму // Советская Белоруссия. – 1957. – 28 мая. – С. 4.*<br>*2. Агафонаў, М. Ля магілы паэта / М. Агафонаў // Беларусь. – 1989. – № 10. – С. 19.*<br><br>Бібліятэка Акадэміі навук БССР сумесна з Інстытутам літаратуры ***атрымалі з Яраслаўля асабістую бібліятэку і архіў сям'і Багдановічаў***: 2300 экзэмпляраў кніг і рукапісных дакументаў, якія адлюстроўваюць творчую дзейнасць беларускага этнографа і вучонага А. Багдановіча і яго сына, паэта М. Багдановіча).<br>*Ефімаў, С. Каштоўны набытак / С. Ефімаў // Маладосць. – 1957. – № 8. – С. 144.* |
| **1958** | ***25 мая*** ў Яраслаўлі адзначылі 41-ю гадавіну са дня смерці М. Багдановіча. Была ўстаноўлена ***мемарыяльная дошка*** ў гонар паэта на доме былой |

| | |
|---|---|
| | гімназіі, дзе вучыўся М. Багдановіч. На ёй напісана:<br>***«Тут у былой мужчынскай гімназіі ў 1908–1911 гг. вучыўся вядомы беларускі паэт М. Багдановіч».***<br>*1. Ушанаванне памяці паэта [М. Багдановіча ў Яраслаўлі ў сувязі з 41-й гадавінай з дня яго смерці] // Літаратура і мастацтва. – 1958. – 4 чэрв. – С. 3.*<br>*2. Чарнецкі, М. Памяці паэта / М. Чарнецкі // Беларусь. – 1958. – № 9. – С. 23.* |
| **1961 (70 гадоў з дня нараджэння М. Багдановіча)** | Выдадзены ***бібліяграфічны даведнік Н. Ватацы*** «Максім Багдановіч», прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння выдатнага беларускага паэта.<br>*1. Аўгусціновіч, М. З якога разліку? / М. Аўгусціновіч // Літаратура і мастацтва. – 1961. – 24 ліст. – С. 3.*<br><br>У Смалявіцкай раённай бібліятэцы імя М. Багдановіча адкрылася ***выстаўка***, на якой экспанаваліся выданні вершаў паэта розных гадоў, фотаздымкі, артыкулы з разглядам творчасці паэта; адбыўся вечар, прысвечаны яго жыццю і творчасці. У калгасныя бібліятэкі Смалявіцкага раёна былі адпраўлены перасоўныя выстаўкі.<br>У бібліятэцы імя паэта // Літаратура і мастацтва. – 1961. – 8 снеж. – С. 3. |
| **1962** | ***24 кастрычніка*** ў Ялце адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця ***мемарыяльнай дошкі*** паэту М. Багдановічу на доме па вуліцы Камунараў. Шыльда мае надпіс: «У гэтым доме правёў апошнія дні свайго жыцця (люты – май 1917 года) выдатны паэт Беларусі Максім Багдановіч» (словы на рускай, украінскай і беларускай мовах).<br>*Адкрыццё мемарыяльнай дошкі паэту Максіму Багдановічу // Звязда. – 1962. – 26 кастр. – С. 4. ; Тое ж гл. // Советская Белоруссия. – 1962. – 26 окт. – С. 4.* |
| **1966 (75 гадоў з дня нараджэння М. Багдановіча)** | Адбыліся мерапрыемствы, прысвечаныя 75-годдзю з дня нараджэння паэта. У Беларускім дзяржаўным універсітэце адбыўся ***вечар,*** прысвечаны М. Багдановічу, з удзелам стрыечнай сястры паэта Г. Валасовіч і яго сябра У. Годнева, які разам з М. Багдановічам вучыўся ў Яраслаўскай гімназіі. Дзяржаўная бібліятэка імя У.І. Леніна (зараз Нацыянальная бібліятэка Беларусі) арганізавала ***выстаўку***, на якой былі прадстаўлены творы паэта, матэрыялы аб творчасці класіка. Таксама ***выстаўка*** прайшла ў Слуцкай гарадской бібліятэцы, дзе быў арганізаваны спецыяльны куток «Максім Багдановіч у музыцы».<br>*Прысвечана юбілею // Літаратура і мастацтва. – 1966. – 9 снеж. – С. 1.* |
| **1967** | У Горкаўскім дзяржаўным музеі А.М. Горкага адбылося ***пасяджэнне членаў Таварыства старых ніжагародцаў***, прысвечанае памяці М. Багдановіча, у якім удзельнічалі мясцовы паэт А. Бараховіч, старшыня Таварыства старых ніжагародцаў П. Сафійскі, стрыечная сястра паэта Г. Валасовіч-Гразнова.<br>*Ватацы, Н. Там, дзе жыў Максім Багдановіч / Н. Ватацы // Літаратура і мастацтва. – 1967. – 20 студз. – С.1.* |

| | |
|---|---|
| | На Украіне выдадзены зборнік ***М. Багдановіча «Лірыка»*** (на ўкраінскай мове).<br>*Лойка, А. Вянок сяброўства / А. Лойка // Літаратура і мастацтва. – 1968. – 23 студз. – С. 3.* |
| **1970** | На сцэне Вялікага тэатра оперы і балета БССР адбылася ***прэм'ера оперы Ю. Семянякі «Зорка Венера»*** (рэжысёр С. Штэйн, лібрэта А. Бачылы), прысвечаная жыццю і творчасці М. Багдановіча.<br>*1. Щербакова, Т. Опера о белорусском поэте / Т. Щербакова // Советская музыка. – 1971. – № 12. – С. 51–53.*<br>*2. Шчарбакова, Т. З невычэрпных крыніц : опера «Зорка Венера» Ю. Семянякі на сцэне Вялікага тэатра оперы і балета БССР / Т. Шчарбакова // Літаратура і мастацтва. – 1971. – 8 студз. – С. 12–13.* |
| **1971 (80 гадоў з дня нараджэння М. Багдановіча)** | У варшаўскім часопісе «Літаратура на свеце» апублікаваны ***пераклады вершаў*** М. Багдановіча «Пагоня», «Дзед», зробленыя Т. Хрусцялеўскім, «Вадзянік», «Белым кветам адзета каліна» – Я. Гушчам.<br>*Вершы Багдановіча па-польску // Літаратура і мастацтва. – 1971. – 15 кастр. – С. 14.*<br><br>***7 снежня*** ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы ***адбыўся вечар,*** прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча, у якім ўдзельнічалі старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР М. Танк, паэты А. Лойка, Е. Лось, салісты Дзяржаўнага народнага хору БССР, Беларускай дзяржаўнай філармоніі, артысты балета Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета, Тэатра юнага гледача. На вечары прысутнічалі міністр культуры БССР Ю.М. Міхневіч, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н.Л. Сняжкова.<br>*Неўміручасць аўтара «Вянка» // Літаратура і мастацтва. – 1971. – 10 снеж. – С. 8.* |
| **1972** | ***18 кастрычніка*** адбылося ***першае знаёмства асецінцаў*** з перакладзенымі на іх родную мову творамі М. Багдановіча. Па Паўночна-Асецінскім радыё ў перадачы «Літаратура сяброў» прагучалі ў эфіры некалькі вершаў паэта (сказаў уступнае слова і чытаў пераклады асецінскі паэт Пятро Умураў).<br>*Рагойша, В. М. Багдановіч загаварыў па-асецінску / В. Рагойша // Літаратура і мастацтва. – 1974. – 16 жн. – С. 16.* |
| **1974** | У пятым нумары часопіса «Мах дуг» (г. Арджанікідзэ), Саюза пісьменнікаў Паўночна-Асецінскай АССР, былі ***надрукаваны вершы М. Багдановіча*** ў перакладзе П. Умурава.<br>*Рагойша, В. М. Багдановіч загаварыў па-асецінску / В. Рагойша // Літаратура і мастацтва. – 1974. – 16 жн. – С. 16.* |
| **1977** | ***У чэрвені*** па прапанове Мінскага абласнога краязнаўчага музея каля в. Ракуцёўшчыны быў ***пастаўлены помнік*** – два камяні. Адзін сімвалізуе свечку вечнай памяці, а на другім размешчаны радкі з «Санета»:<br>Хоць зернейкі засохшыя былі,<br>Усё ж такі жыццёвая іх сіла<br>Збудзілася і буйна ўскаласіла |

| | |
|---|---|
| | Парой вясенняй збожжа на раллі.<br>*Мікута, В. І. «Радзімая зямля, прынікнуў я к табе...» : Багдановіч у Вільні і Ракуцёўшчыне / В. І. Мікута // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1991. – № 7–8. – С. 116–120.* |
| **1981 (90 гадоў з дня нараджэння М. Багдановіча)** | ***24 красавіка*** беларускія пісьменнікі ў в. Ракуцёўшчыне заклалі «Максімаў сад»: 70 дрэў, якія сімвалізуюць тыя гады, што мінулі з часу гасцявання паэта ў гэтай вёсцы.<br>*1. Каханоўскі, Г. Доказ пашаны і любві / Г. Каханоўскі // Звязда. – 1981. – 9 снеж. – С. 4.*<br>*2. Кохановский, Г. Максимов сад / Г. Кохановский // Сельская газета. – 1981. – 8 дек. – С. 3.*<br><br>***29 жніўня*** ў Мінску ў кінатэатры «Кастрычнік» адбылося ўрачыстае адкрыццё ***Рэспубліканскага свята паэзіі***, прысвечанага 90-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча, у якім удзельнічалі М. Танк, Н. Гілевіч, М. Лужанін, Р. Барадулін, Я. Брыль, Т. Бондар, В. Іпатава, У. Някляеў, а таксама А. Грачанікаў, вершы якога гучалі на рускай, украінскай, латышскай, літоўскай мовах; артысты Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы імя Р. Шырмы, Беларускай дзяржаўнай філармоніі.<br>У Парку культуры і адпачынку імя Чалюскінцаў адбылася ***сустрэча паэтаў*** Э. Агняцвет, Т. Бондар, А. Вольскага М. Федзюковіча са школьнікамі.<br>*Марціновіч, А. Зорцы Максіма Багдановіча ззяць вечна / А. Марціновіч // Літаратура і мастацтва. – 1981. – 4 вер. – С. 3.*<br><br>***У лістападзе*** ў Доме літаратара адбыўся музычна-паэтычны вечар, прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча, у якім удзельнічалі даследчыца творчасці паэта, бібліёграф Н. Ватацы, кампазітар Ю. Семяняка, артысты мінскіх тэатраў.<br>*Чаркасава, Д. Багдановіч і музыка / Д. Чаркасава // Голас Радзімы. – 1981. – 26 лістап. – С. 6.*<br><br>***4 снежня*** ў Львоўскай нацыянальнай навуковай бібліятэцы НАН УССР імя В. Стэфаніка адкрылася ***выстаўка «Пясняр братэрства»***, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча, на якой было прадстаўлена больш за 200 выданняў. У канферэнц-зале Львоўскай абласной арганізацыі таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры адбыўся ***літаратурна-мастацкі вечар*** з удзелам украінскіх і беларускіх пісьменнікаў, журналістаў, вучоных, студэнтаў Львоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя І. Франка.<br>*Урачыстасці ў Львове // Літаратура і мастацтва. – 1981. – 11 снеж. – С. 2.*<br><br>**У снежні** на Украіне ў Сумскім педагагічным інстытуце адбылася канферэнцыя «Максім Багдановіч і Украіна».<br>*Перацяцька, А. З братняй любоўю / А. Перацяцька // Літаратура і мастацтва. – 1981. – 11 снеж. – С. 3.*<br><br>***8–17 снежня*** ў Палацы мастацтва прайшла Рэспубліканская выстаўка выяўленчага мастацтва, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча.<br>*1. Трыгубовіч, В. «Пачуццё з душы бяжыць...» / В. Трыгубовіч //* |

| | |
|---|---|
| | *Голас Радзімы. – 1981. – 17 снеж. – С. 8.*<br>*2. Васілеўскі, П. «Светлы след будзе вечна жывым» / П. Васілеўскі // Літаратура і мастацтва. – 1982. – 1 студз. – С. 11.*<br>*3. Матусевич, К. «І весь у спомінах устане, ажыве...» / К. Матусевич // Нёман. – 1982. – № 4. – С. 172–176.*<br><br>***9 снежня*** каля Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР быў адкрыты ***помнік*** паэту (аўтары: скульптар С. Вакар і архітэктары Л. Маскалевіч і Ю. Казакоў). У памяшканні тэатра прайшоў урачысты вечар, у якім прымалі ўдзел старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі М. Танк, першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Н. Гілевіч, паэт Г. Гарэцкі, С. Вакар, маскоўскі паэт І. Шклярэўскі, паэт і перакладчык, старшыня Львоўскай арганізацыі Саюза пісьменнікаў Украіны Р. Лубкіўскі, пісьменніца з Вільнюса Э. Легутэ, ленінградскі паэт А. Мінчкоўскі, паэты Г. Бядняеў (Горкі) і І. Смірноў (Яраслаўль), а таксама артысты М. Захарэвіч, Л. Давідовіч, С. Данілюк, фальклорны гурт «Купалінка».<br>*1. Анісковіч, У. Талент самабытны, шматгранны, глыбокі / У. Анісковіч, А. Пісьмянкоў, А. Сідарэвіч // Літаратура і мастацтва. – 1981. – 18 снеж. – С. 5–7.*<br>*2. Талент жывы і вечны // Звязда. – 1981. – 12 снеж. – С. 1, 3.*<br>*3. Ватацы, Н. У вянок Максіму / Н. Ватацы // Голас Радзімы. – 1981. – 17 снеж. – С. 6–7.*<br>*4. Нязгасная зорка паэта // Звязда. – 1981. – 10 снеж. – С. 4.*<br><br>***9 снежня*** па Беларускім тэлебачанні рэдакцыя праграм для моладзі паказала ***тэлевізійную кампазіцыю «Шчасце толькі глянула нясмела»*** з цыкла «Літаратурны тэатр» (рэжысёр Б. Ганага). У ролі паэта выступіў акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага М. Пінігін.<br>*Сяргеева, М. У родным краю ёсць крыніца / М. Сяргеева, В. Козел / Літаратура і мастацтва. – 1981. – 4 снеж. – С. 12.*<br><br>***У снежні*** выдавецтва «Мастацкая літаратура» выпусціла ***факсімільнае выданне*** зборніка «Вянок» М. Багдановіча (тыраж 10000 экз.).<br><br>Прайшла ***навуковая канферэнцыя***, прысвечаная творчасці паэта, арганізаваная аддзяленнем грамадскіх навук Акадэміі навук БССР, саюзам пісьменнікаў БССР, Інстытутам літаратуры імя Я. Купалы.<br><br>У Саюзе кампазітараў Беларусі адбыўся ***літаратурна-музычны вечар***.<br><br>У Дзяржаўнай бібліятэцы імя У.І. Леніна (зараз Нацыянальная бібліятэка Беларусі) прайшоў ***вечар***, прысвечаны жыццю і творчасці паэта.<br>На філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта прайшло ***літаратурна-музычнае свята*** з удзелам беларускіх літаратараў, кампазітараў, а таксама паэтаў-перакладчыкаў з Украіны і Расіі. Быў праведзены студэнцкі конкурс на лепшы верш у гонар М. Багдановіча.<br><br>У Маладзечна прайшла ***выстаўка*** работ мясцовых мастакоў, адбыўся ***канцэрт*** з удзелам выкладчыкаў і навучэнцаў музычнага вучылішча.<br>*1. Віктарэнка, П. І вершы, і музыка / П. Віктарэнка // Літаратура і* |

| | |
|---|---|
| | *мастацтва. – 1981. – 11 снеж. – С. 2.*<br>*2. Факсімільнае выданне Вянка // Літаратура і мастацтва. – 1981. – 11 снеж. – С. 3.*<br>*3. Перад чытачамі Ленінкі // Літаратура і мастацтва. – 1981. – 11 снеж. – С. 3.*<br><br>***У снежні*** у Смалявіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М. Багдановіча адбылося святкаванне 90-годдзя з дня нараджэння паэта. Прайшлі ***літаратурныя віктарыны***, ***конкурс*** на лепшае выкананне твораў паэта, ***выстаўкі*** «Напісана рукой М. Багдановіча», «Навечна ў памяці народнай», ***літаратурна-музычны вечар*** «Так ярка пражыць – лепшай долі няма на Зямлі».<br>*Кірына, Л. У бібліятэцы яго імя / Л. Кірына // Літаратура і мастацтва. – 1981. – 4 снеж. – С. 2.*<br><br>***11 снежня ў*** Маскве ў Цэнтральным доме літаратараў імя А. Фадзеева адбылося ***свята***, прысвечанае 90-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча. Ва ўрачыстым вечары прымалі ўдзел прадстаўнічая дэлегацыя з Беларусі на чале з намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР Н.Л. Сняжковай, старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі М. Танкам, першым сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Н. Гілевічам, вядомым беларускім гісторыкам М. Улашчыкам, а таксама сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Я. Ісаеў, рускі паэт-перакладчык В. Карчагін, украінская паэтэса Т. Каламіец, літоўскі пісьменнік А. Дрылінга. Прайшоў ***канцэрт майстроў мастацтва Беларусі,*** у якім удзельнічалі артысткі М. Захарэвіч і Л. Давідовіч, Г. Рыжкова, Н. Кавалёва і ансамбль цымбалістак Беларускай дзяржаўнай філармоніі, фальклорна-харэаграфічны ансамбль «Харошкі» і інш.<br>*1. Марціновіч, А. Навечна ў памяці народнай / А. Марціновіч // Літаратура і мастацтва. – 1981. – 18 снеж. – С. 4.*<br>*2. Блізкі ўсім // Літаратура і мастацтва. – 1981. – 11 снеж. – С. 3.*<br><br>У Мінску створаны музей М. Багдановіча, які часова размясціўся ў адным з пакояў Літаратурнага музея Я. Купалы.<br>*Вішнеўскі, А. Вяртаецца Максім у Мінск / А. Вішнеўскі // Літаратура і мастацтва. – 1981. – 4 снеж. – С. 4.* |
| **1982** | ***Урачыстыя мерапрыемствы***, прысвечаныя 90-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча, прайшлі ў Ялце:<br>– у парку санаторыя каля помніка паэту «Беларусь» адбыўся ***мітынг***;<br>– прайшоў ***літаратурна-мастацкі вечар***, падрыхтаваны Ялцінскай арганізацыяй добраахвотнага таварыства аматараў кнігі сумесна з адміністрацыяй санаторыя;<br>– у клубе санаторыя была арганізавана ***выстаўка «Максім Багдановіч. Шлях паэта»***;<br>– група пісьменнікаў, работнікі санаторыя і супрацоўнікі Ялцінскага краязнаўчага музея ***ўсклалі кветкі*** на магілу М.Багдановіча;<br>*Барская, Т. У светлым краі / Т. Барская // Літаратура і мастацтва. – 1982. – 15 студз. – С. 8.*<br><br>У Харкаве ў пісьменніцкім клубе адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны М. Багдановічу, у якім удзельнічалі пісьменнікі, навукоўцы, члены абласной |

| | |
|---|---|
| | літаратурнай студыі імя П. Тычыны, студэнты, паэтэса М. Львовіч, пісьменнік В. Цімчанка і інш.<br>*Леанідаў, Б. Напоўнены цяплом і святлом // Літаратура і мастацтва. – 1982. – 15 студз. – С. 8.*<br><br>Студэнты філфака Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У.І. Леніна правялі ***ўрок Максіма Багдановіча*** на радзіме Я. Купалы ў Вязынскай васьмігадовай школе.<br>*Чыгрын, С. Урок Максіма Багдановіча / С. Чыгрын // Літаратура і мастацтва. – 1982. – 15 студз. – С. 8.*<br><br>Горкаўскі гарадскі выканаўчы камітэт народных дэпутатаў прыняў рашэнне ўстанавіць на будынку Педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага (былой Ніжагародскай гімназіі) ***мемарыяльную дошку*** М. Багдановічу.<br>*Пазнякоў, М. Мемарыяльная дошка Багдановічу ў Горкім / М. Пазнякоў // Літаратура і мастацтва. – 1982. – 9 крас. – С. 2.* |
| **1983** | На Беларускай тэлестудыі выйшаў ***фільм*** пра М. Багдановіча ***«Я не самотны»*** (рэжысёр. І. Калоўскі, сцэнарыст Р. Тармола).<br>*Бабкова, А. Паэтычная элегія / А. Бабкова // Чырвоная змена. – 1983. – 29 студз. – С. 4.*<br><br>У сярэдняй школе в. Вяззе (Асіповіцкі раён) адбыўся ***літаратурны вечар***, прысвечаны М. Багдановічу, у якім удзельнічалі супрацоўнікі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча (Мінск). Была арганізавана перасоўная выстаўка «Жыццёвы і творчы шлях паэта».<br>*Садоўская, Ю. Тут быў Максім Багдановіч / Ю. Садоўская, Я. Садоўскі // Магілёўская праўда. – 1983. – 28 ліп. – С. 4.* |
| **1984** | ***6 студзеня*** ў Ніжнім Ноўгарадзе на будынку Педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага адбылося адкрыццё ***мемарыяльнай дошкі*** паэту М. Багдановічу (скульптар С. Вакар). Шыльда мае надпіс: *«В этом здании бывшей Нижегородской гимназии в 1902–1908 годах учился выдающийся белорусский поэт Максим Богданович (1891–1917)»*.<br>*1. Бараховіч, А. Я. «...Вечнай свежасцю вее ад іх імёнаў» : Ніжні Ноўгарад у лёсе М. Багдановіча / А. Я. Бараховіч // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1991. – № 9. – С. 70–79.*<br>*2. Барахович, А. Память – в бронзе, память – в сердце / А. Барахович // Неман. – 1985. – № 3. – С. 165–166.*<br><br>У ***чэрвені*** ў в. Ракуцёўшчыне (Маладзечанскі раён), дзе жыў і працаваў класік беларускай літаратуры М. Багдановіч, адбылося ***свята паэзіі і песні***, арганізаванае Літаратурным музеем М. Багдановіча, Мінскім абласным краязнаўчым музеем. У мерапрыемстве прымалі ўдзел беларускія пісьменнікі, самадзейныя артысты, супрацоўнікі музея.<br>*Крук, У. Шчырым словам, звонкай песняй / У. Крук // Літаратура і мастацтва. – 1984. – 8 чэрв. – С. 14.* |
| **1985** | У ***ліпені*** ў в. Ракуцёўшчыне (Маладзечанскі раён), у філіяле Літаратурнага музея М. Багдановіча адбылося ***свята паэзіі і песні***, прысвечанае памяці пісьменніка, з удзелам паэтаў М. Лужаніна, Д. Бічэль-Загнетавай, У. Мазго, С. Шушкевіча, гісторыка М. Ермаловіча, а таксама ансамбля народных інструментаў Маркаўскага сельскага Дома культуры, самадзейных артыстаў |

| | |
|---|---|
| | сельскіх клубаў, маладзечанскага музычнага вучылішча і дзіцячай музычнай школы.<br>*1. Лешкович, В. У живой воды : праздник в честь М. Богдановича в Ракутевщине Молодеченского района] / В. Лешкович // Сельская газета. – 1985. – 21 июля.*<br>*2. Кароткая, Т. Бруіць Максімава крыніца / Т. Кароткая // Голас Радзімы. – 1985. – 11 ліп. – С. 6.*<br><br>У выдавецтве «Юнацтва» (серыя «Паэтычная бібліятэка») быў ***выдадзены на рускай мове зборнік «Вянок»*** М. Багдановіча ў перакладзе Б. Спрынчана.<br>*Лосеў, Г. «Венок» ... у вянок памяці / Г. Лосеў // Літаратура і мастацтва. – 1985. – 9 мая. – С. 15.* |
| **1986 (95 гадоў з дня нараджэння М. Багдановіча)** | ***У маі*** ў Гродне, у доме, дзе прайшлі дзіцячыя гады Максіма, адкрыўся ***Музей Максіма Багдановіча***. Адбыўся ***вечар памяці*** паэта, дэманстравалася ***экспазіцыя***, прысвечаная яго жыццю і творчасці.<br>У Дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы адбыўся ***літаратурны вечар*** у гонар паэта.<br>У Гродзенскім сельскагаспадарчым інстытуце адбыўся ***вечар «М. Багдановіч – паэт моладзі»***, арганізаваны бібліятэкарам навуковай бібліятэкі інстытута К.І. Сянкевіч.<br>*1. Островцов, С. В доме поэта / С. Островцов // Гродненская правда. – 1986. – 21 мая. – С. 4.*<br>*2. Климович, А. В гости к поэту / А. Климович // Гродненская правда. – 1987. – 30 мая. – С. 4.*<br><br>***У снежані*** ў Ялце, у кінатэатры «Спартак», прайшла ***выстаўка,*** прысвечаная жыццю і творчасці М. Багдановіча.<br>*Ляшковіч, В. Васількі на магіле Максіма / В. Ляшковіч // Літаратура і мастацтва. – 1987. – 5 чэрв. – С. 13.* |
| **1991 (100 гадоў з дня нараджэння М. Багдановіча)** | ***Па рашэнні ЮНЕСКА 1991 г. аб’яўлены Годам Максіма Багдановіча.***<br><br>***26 мая*** ў Мінску, каля помніка М. Багдановіча, ***музычна-паэтычным святам «Прысвячаецца паэту»*** распачаўся Год Максіма Багдановіча. У мерапрыемстве ўдзельнічалі жыхары сталіцы, удзельнікі міжнароднага кангрэса беларусістаў, фальклорныя калектывы Міншчыны. Была прадстаўлена музейная экспазіцыя, прысвечаная паэту.<br>*Пад зоркай Максіма // Літаратура і мастацтва. – 1991. – 31 мая. – С. 2.*<br><br>***26 мая*** ў Кліўлендзе, у культурна-асветніцкім цэнтры «Полацак», адбылася ***акадэмія***, прысвечаная памяці М. Багдановіча. Экспанаваліся выстаўкі: «Вянок» Максіма Багдановіча» з твораў Я. Ціхановіча, А. Лапіцкай, Г. Грака і «Максімава Яраславія» з фотаархіва С. Белай.<br>*Анатольева, С. Багдановічаўскі каляндар: 1891–1991 / С. Анатольева // Полацак. – 1991. – № 10. – С. 29–31.*<br><br>У Ялце прайшло ***свята беларускай культуры,*** прысвечанае 100-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча. Каля магілы паэта адбыўся ***ўрачысты сход***; у школе № 1 быў праведзены ***Багдановічаўскі ўрок*** (правялі яго В. Іпатава, В. Зуёнак, Н. Загорская, В. Каваленка, А. Лойка, Г. Пашкоў); у |

| | |
|---|---|
| | Ялцінскім дзяржаўным аб'яднаным гісторыка-літаратурным музеі адкрылася ***выстаўка***, прысвечаная жыццю і творчасці М. Багдановіча. ***Свята***, прысвечанае памяці паэта, прайшло на сцэне Драматычнага тэатра імя А.П. Чэхава, дзе чыталіся даклады, выконваліся вершы і песні М. Багдановіча. У канцэртнай зале «Юбілейная» прайшоў ***канцэрт*** з удзелам народнага артыста БССР В. Вуячыча, ансамбляў «Сябры», «Свята» і інш.<br>*Марціновіч, А. У краіне светлай, ля сіняй бухты / А. Марціновіч // Літаратура і мастацтва. – 1991. – 31 мая. – С. 5, 12.*<br><br>***25 чэрвеня*** ў Мінску (завулак Рабкораўскі, 19) адбылося адкрыццё філіяла Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ***«Беларуская хатка»***.<br>*1. Акулін, Э. А. Дом на Мала–Георгіеўскай... : філіял музея М. Багдановіча // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1991. – № 7/8. – С. 125–127.*<br>*2. Акулін, Э. «Беларуская хатка» чакае вас!.. / Э. Акулін // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1991. – № 12. – С. 20.*<br>*3. Пучынскі, У. Тут жыў Багдановіч / У. Пучынскі // Народная газета. – 1991. – 27 чэрв. – С. 1, 4.*<br><br>**У жнівені** ў в. Вяззе (Асіповіцкі раён) прайшлі ***мерапрыемствы*** па ўшанаванні памяці М. Багдановіча, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння паэта, у якіх прымалі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства культуры БССР, пісьменнікі Н. Загорская, Я. Міклашэўскі, І. Аношкін, літаратуразнаўца Я. Клімуць, народныя ансамблі танца «Юнацтва», народнай песні «Люлечка», фальклорныя ансамблі Магілёўскай вобласці.<br>Афіцыйная дэлегацыя на чале з намеснікам міністра культуры БССР У. Гілепам пабывала ў хаце, дзе некалькі месяцаў жыў маленькі Максім, усклала кветкі да мемарыяльнай дошкі, на якой ёсць надпіс «У гэтым доме пражыў лета 1895 года будучы выдатны паэт Беларусі Максім Багдановіч». Наведалі сярэднюю школу, у якой знаходзіцца клас-музей М. Багдановіча.<br>Адбылося ***тэатралізаванае свята «Свяціце, зоркі надзеі»***, арганізаванае ўпраўленнем культуры Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта, аддзелам культуры Асіповіцкага раённага выканаўчага камітэта, Літаратурным музеем Максіма Багдановіча і абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі. ***Свята каля Дома культуры*** сабрала жыхароў Вяззя і навакольных вёсак, аматараў паэзіі з раённага цэнтра.<br>У сярэдняй школе прайшоў ***літаратурна-музычны вечар***, у якім прымалі ўдзел выкладчыкі, аспіранты і студэнты Мінскага педінстытута імя А.М. Горкага.<br>*1. Якаўлева, Р. «І думкі мкнуцца мімаволі...» / Р. Якаўлева // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1991. – № 6. – С. 68.*<br>*2. Марціновіч, А. Яшчэ адзін куточак запаветны... / А. Марціновіч // Літаратура і мастацтва. – 1991. – 30 жн. – С. 4.*<br>*3. Пехцераў, І. Вянок паэту – з Вяззя / І. Пехцераў // Магілёўская праўда. – 1991. – 7 верас. – С. 4.*<br>*4. Пехцераў, І. І зорка гарыць, і не вяне вянок / І. Пехцераў // Белорусская нива. – 1991. – 29 окт. – С. 3.*<br><br>***1 верасня*** ў філіяле Літаратурнага музея Максіма Багдановіча «Фальварак Ракуцёўшчына» (Маладзечанскі раён) адбылося ***музычна-паэтычнае свята,*** прысвечанае 100-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча, арганізаванае Літаратурным музеем Максіма Багдановіча. |

| | |
|---|---|
| | *Марціновіч, А. «Глядзі, беларус, у строгія, чыстыя вочы Максіма» / А. Марціновіч // Літаратура і мастацтва. – 1991. – 6 верас. – С. 4.*<br><br>***30 верасня*** адбыўся ***канцэрт В. Скорабагатава*** з цыкла «Анталогія беларускага раманса», прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча.<br>*Песнякевіч, Т. І з ціхай радасцю чытаю... / Т. Песнякевіч // Літаратура і мастацтва. – 1991. – 11 кастр. – С. 10.*<br><br>***30 кастрычніка*** ў штаб кватэры ЮНЕСКА (Францыя) ў час 26-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА прайшоў ***вечар***, прысвечаны памяці М. Багдановіча. У мерапрыемстве прымала ўдзел дэлегацыя Рэспублікі Беларусь, якую ўзначальваў А. Вярцінскі. Вечару быў прысвечаны чарговы нумар «ЮНЕСКА-прэс».<br>*Краўчанка, П. «...Мы ўсе разам ляцім да зор» / П. Краўчанка // Звязда. – 1991. – 7 снеж. – С.* 1.<br><br>***4 лістапада*** ў Нью-Ёрку, у штаб-кватэры ААН, прайшоў ***вечар***, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча, з удзелам міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь П. Краўчанкі.<br>*Краўчанка, П. Сын зямлі беларускай / П. Краўчанка // Добры вечар – 1991. – 6 снеж. – С. 1.*<br><br>***11 лістапада*** ў Ніжнім Ноўгарадзе з’явілася ***вуліца*** імя Максіма Багдановіча.<br><br>***11–13 лістапада*** ў Гродне прайшлі ***Дні Беларускага фонду культуры***, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча. Адбыліся наступныя мерапрыемствы: выстаўка выяўленчага мастацтва, выстаўка-кірмаш твораў беларускіх народных майстроў, спектаклі батлеечнага тэатра, створанага пры Літаратурным музеі Максіма Багдановіча, выступленні фальклорнага тэатра «Госціца» і фальклорнай групы «Літвіны».<br>*Скварцоў, В. Культура чакаць не можа / В. Скварцоў; запісала В. Кудраўцава // Гродненская правда. – 1991. – 12 нояб. – С. 1.*<br><br>***28 лістапада*** ў Вільнюскім універсітэце прайшла ***канферэнцыя***, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча, якую арганізавалі Асацыяцыя беларусістаў у Літве і кафедра рускай літаратуры.<br><br>На працягу трох месяцаў (***верасень–лістапад***) праходзіў ***рэспубліканскі мастацка-краязнаўчы конкурс «Зорка Венера»***, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння паэта, у якім прымалі ўдзел як асобныя вучні, так і калектывы (класы, групы, гурткі) школ, прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, пазашкольных устаноў.<br>*Конкурс «Зорка Венера» // Чырвоная змена. – 1991. – 2–8 верас. – С. 17.*<br><br>***6 снежня*** ў Мінску, у Палацы мастацтваў, адкрылася ***выстаўка жывапісу, графікі, скульптуры***, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча.<br>*1. Калкоўскі, У. Спатканне з Максімам / У. Калкоўскі // Акно. – 1992. – № 1. – С. 85–88.* |

| | |
|---|---|
| | *2. Культура? Асьветніцтва? Мастацтва? / запісала А. Чарняўская // Мастацтва. – 1992. – № 5. – С. 6–27.*<br>*3. Краса, і светласць, і прастор // Голас Радзімы. – 1991. – 19 снеж. – С. 7.*<br><br>***8 снежня*** ў Мінску, у Траецкім прадмесці, адкрыўся Літаратурны музей Максіма Багдановіча, які быў заснаваны ў 1981 годзе.<br><br>***9 снежня*** вуліца Максіма Горкага была перайменавана ў вуліцу Максіма Багдановіча.<br>*Струменскі, С. Радаслоўная Максіма Багдановіча / С. Струменскі // Голас Радзімы. – 1991. – 26 снеж. – С. 7.*<br><br>***9 снежня*** ў Акадэміі навук Беларусі адкрылася ***канферэнцыя*** «Актуальныя праблемы багдановічазнаўства», прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча.<br>*Анатольева, С. Багдановічаўскі каляндар : 1891–1991 / С. Анатольева // Полацак. – 1991. – № 10. – С. 29–31.*<br><br>***9 снежня*** ў Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатра оперы і балета адбыўся ***ўрачысты вечар***, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча. У мерапрыемстве прымалі ўдзел генеральны дырэктар ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА) Федэрыка Маёр; паэты Н. Гілевіч, В. Зуёнак, Р. Барадулін; вучоны А. Лойка; нямецкамоўны беларусіст, перакладчык Багдановіча на нямецкую мову Фердынанд Найрайтэр з Аўстрыі; прафесар Варшаўскага ўніверсітэта Алесь Барскі; паэт з Украіны Р. Лубкіўскі; госці з Яраслаўля і Ніжняга Ноўгарада Ю. Вярбіцкі і В. Собалеў і інш.<br>*Паэзія жывая, як само жыццё // Голас Радзімы. – 1991. – 19 снеж. – С. 6.*<br><br>***12–15 снежня*** ў Таліне 100-годдзе з дня нараджэння М. Багдановіча адзначылі Эстонскае таварыства славянскіх культур і Беларускі фонд славянскага пісьменства і славянскіх культур сумесна з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь. У мерапрыемстве прымалі ўдзел пісьменнікі і артысты з Беларусі.<br>*Беларуска, Ю. Ды свяціцца імя тваё, Максім / Ю Беларуска // Чырвоная змена. – 1991. – 2–8 верас. – С. 12–13.*<br><br>***У снежні*** ў Мінску, у Доме літаратара, прайшоў вечар, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча, у якім прымалі ўдзел беларускія пісьменнікі і паэты, акцёры мінскіх тэатраў, кампазітары.<br><br>У Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі прайшла ***мастацкая выстаўка,*** прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча. На выстаўцы прадстаўлены творы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва А. Ксяндзова, Р. Таболіча, Л. Пятруль, А. Марачкіна, А. Панцюка, В. Альшэўскага, Б. Аракчэева, А. Ларыёнава, А. Лапіцкай, В. Нямцова і інш.<br>*Бурак, Г. «Я хацеў бы сустрэцца з вамі...» / Г. Бурак // Гродненская правда. – 1991. – 13 дек. – С. 1.* |

| | |
|---|---|
| | У Вяляціцкай сярэдняй школе (Барысаўскі раён) адбылося ***свята***, прысвечанае 100-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча, у якім удзельнічалі вучні і настаўнікі школы, а таксама паэтэса Т. Зіненка, самадзейныя артысты Дома культуры.<br>*Чалей, М. На юбілейнай вярсце / М. Чалей // Мінская праўда. – 1991. – 7 снеж. – С. 3.*<br><br>У в. Вішнявец (Стаўбцоўскі раён) адбылося ***літаратурнае свята***, прысвечанае 100-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча, арганізаванае Стаўбцоўскім раённым выканаўчым камітэтам і Літаратурным музеем Якуба Коласа. У мерапрыемстве ўдзельнічалі пісьменнікі П. Прыходзька, Я. Хвалей, А. Рыбак, супрацоўнікі Літаратурнага музея Якуба Коласа, народныя калектывы Стаўбцоўшчыны.<br>*Галоўка, С. Паяднала Максімава слова / С. Галоўка // Мінская праўда. – 1991. – 25 снеж. – С. 4.* |
| **1992** | ***У лютым,*** у Беларускай дзяржаўнай філармоніі, адбылася ***прэм'ера поп-оперы*** І. Паліводы «Максім» (лібрэта Л. Пранчака) паводле твораў М. Багдановіча.<br>*1. Берасцень, С. «Не разбіць, не спыніць, не стрымаць»/ С. Берасцень // Літаратура і мастацтва. – 1991. – 10 кастр. – С. 10.*<br>*2. Бунцэвіч, Н. Пойздем у оперу? Да Максіма! / Н. Бунцэвіч // Роднае слова. – 1995. – № 5. – С. 145–151.*<br><br>***10 сакавіка*** ў Львоўскім дзяржаўным універсітэце імя І. Франко прайшлі ***Багдановічаўскія чытанні***, прысвечаныя ўшанаванню памяці паэта, у якіх удзельнічала група беларускіх пісьменнікаў (Т. Кабржыцкая, С. Законнікаў, С. Панізнік, В. Рагойша). Гучалі ***навуковыя даклады*** львоўскіх літаратуразнаўцаў і беларускіх гасцей, адбыліся ***паэтычныя выступленні, сустрэчы*** з чытачамі і супрацоўнікамі Львоўскай навуковай бібліятэкі імя Ф. Стафаніка (у бібліятэцы ***адкрылася багдановічаўская выстаўка***), з навучэнцамі паліграфічнага вучылішча імя І. Фёдарава.<br>*Рагойша, В. Шаўчэнка, Багдановіч... / В. Рагойша // Літаратура і мастацтва. – 1992. – 10 крас. – С. 7.*<br><br>У Мінску, у Доме літаратара, адбыўся ***вечар «Максім Багдановіч у музыцы»***, у якім прымаў удзел госць з Санкт-Пецярбурга кампазітар І. Маціеўскі.<br>*Гардзіенка, П. Багдановіч... з берагоў Нявы / П. Гардзіенка // Літаратура і мастацтва. – 1992. – 27 сак. – С. 13.*<br><br>Адкрылася ***новая экспазіцыя*** Літаратурнага музея Максіма Багдановіча (мастацкае афармленне Э. Агуновіча), прымеркаваная да 101-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча.<br>*Качаткова, П. Музей у стылі мадэрн / А. Качаткова, В. Мікута // Культура. – 1992. – 7 снеж. – С. 2.* |
| **1994** | ***28 мая*** на Чырвонай (Сямёнаўскай) плошчы, каля будынка Яраслаўскага дзяржаўнага ўніверсітэта (былой мужчынскай гімназіі) быў ***устаноўлены бронзавы помнік*** Максіму Багдановічу (скульптар С. Вакар).<br>*1. Менская, С. Вяртанне / С. Менская // Полацак (Кліўленд). – 1994. – № 5. – С. 27–31.* |

| | |
|---|---|
| | *2. Менская, С. Максім Багдановіч вярнуўся ў Яраславію / С. Менская // Беларусь. – 1995. – № 2. – С. 24–25.*<br><br>У Яраслаўлі, у мемарыяльным доме-музе Багдановічаў, прайшла выстаўка ***«Беларускі паэт з берагоў Волгі»***, на якой былі прадстаўлены экспанаты (114 адзінак) з фондаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча (Мінск). На базе дома Багдановіча ***створаны Цэнтр беларускай культуры.***<br><br>Пасля двух гадоў рамонту ў Гродне адкрыўся ***Музей Максіма Багдановіча*** (заснаваны ў 1986 г.). Да ўжо існуючых экспазіцый, якія існавалі раней у чатырох пакоях, дабавіліся новыя, павялічылася само памяшканне.<br>*Папко, І. Музей М. Багдановіча адчыняе дзверы [ў Гродне] / І. Папко // Гродзенская праўда. – 1994. – 31 мая.*<br><br>***У канцы снежня*** ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча адбылося адкрыццё выстаўкі, прысвечанай 103-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка. У экспазіцыі былі прадстаўлены творы розных відаў выяўленчага мастацтва, скульптура, партрэты паэта і сямейныя партрэты Багдановічаў, ілюстрацыі да твораў класіка.<br>*Крэнь, І. «Як сімвал, як заклік, як ідэя» / І. Крэнь // Наша слова. – 1995. – 25 студз. – С. 7.* |
| **1996 (105 гадоў з дня нараджэння М. Багдановіча)** | У ***маі*** ў Гродна прайшоў Міжнародны ***конкурс юных кампазітараў імя М. Багдановіча «Надзея–96».***<br>*Морых, І. Конкурс Багдановіча... без Багдановіча / І. Морых // Мастацтва. – 1997. – № 2. – С. 9–10.*<br><br>***27 ліпеня*** ў в. Ракуцёўшчыне (Маладзечанскі раён) адбылося ***свята паэзіі і песні «Ракуцёўскае лета – 1996»***, прысвечанае 105-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча, у якім прымалі ўдзел дырэктар Літаратурнага музея Максіма Багдановіча; навуковец-даследчык А. Бяляцкі; дырэктар Гродзенскага музея Максіма Багдановіча Д. Бічэль-Загнетава; барды А. Камоцкі, В. Шалкевіч, А. Мельнікаў, А. Атаманаў; паэты А. Чобат, Л. Дранько-Майсюк, Л. Рублеўская, В. Шніп, М. Скобла. Э. Акулін і інш.; артысты Нацыянальнага акадэмічнага тэатру імя Я. Купалы В. Манаеў і А. Сідарава.<br>*1. Хатэнка, А. «Мне доўгае расстанне з вамі...» / А. Хатэнка // Голас Радзімы. – 1996. – 15 жніў. – С. 1, 7.*<br>*2. Мікалайчанка, А. «Ракуцёўскае лета» з Максімам Багдановічам / А. Мікалайчанка // Наша слова. – 1996. – 15 жніў. – С. 1–2.*<br>*3. Чыгір, Г. І хай жа палёт яго доўжыцца цэлую вечнасць / Г. Чыгір // Народная газета. – 1996. – 31 ліп. – С. 2.* |
| **1997** | У Доме літаратара, па ініцыятыве Літаратурнага музея Максіма Багдановіча адбылася ***вечарына «Мне доўгае расстанне з вамі…»***, прымеркаваная да дня нараджэння паэта. У мерапрыемстве прымалі ўдзел паэт А. Разанаў; паэт, дырэктар Гродненскага музея Максіма Багдановіча Д. Бічэль; першы сакратар Пасольства Украіны ў Рэспубліцы Беларусь І. Бунечка; выкладчык Мінскага лінгвістычнага ўніверсітэта В. Ермаловіч; паэт Э. Акулін і інш. |
| **1998** | У ***ліпені*** ў в. Ракуцёўшчына (Маладзечанскі раён) адбылося ***свята паэзіі і песні***, прысвечанае памяці М. Багдановіча. |

| | |
|---|---|
| **1999** | ***22 лютага*** ў Гродне адзначыла 130-годдзе з дня нараджэння маці М. Багдановіча Марыі Апанасаўны Багдановіч-Мякоты. У мерапрыемстве ўдзельнічалі дырэктар Гродзенскага музея Максіма Багдановіча Д. Бічэль-Загнетава, выкладчыца Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы А. Петрушкевіч, маладыя паэты А. Брусевіч, В. Руселік і інш.<br>*Кісель, З. Род ваяроў, святароў і паэтаў / З. Кісель // Ніва. – 1999. – 14 сак. – С. 2.*<br><br>Напрыканцы ***лютага*** Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь быў аб'яўлены ***бліц-конкурс*** на лепшы эскізны архітэктурна-пластычны праект надмагільнага помніка Максіму Багдановічу ў Ялце.<br>***31 сакавіка*** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адкрылася ***выстаўка макетаў помнікаў*** і адбылося іх першае ***абмеркаванне*** членамі журы.<br>*Філіповіч, А. Вердыкт пакуль не канчатковы... / А. Філіповіч // Культура. – 1999. – 17–23 крас. (№ 14). – С. 2.* |
| **2001** | У 2001 г. у навучальных установах Гродзенскай вобласці праводзіўся ***абласны конкурс*** на лепшы ўласны твор, прысвечаны 110-й гадавіне з дня нараджэння М. Багдановіча, сярод вучняў школ і навучэнцаў ПТВ.<br>*У вянок Максіму Багдановічу : Зб. творчых работ вучняў шк. і навучэнцаў ПТВ / Уклад.: М.Г. Бубешка і інш. – Гродна, 2002. – 69 с.*<br><br>***У студзені–сакавіку*** ў Польшчы, у Гайнаўскім беларускім ліцэі, прайшла ***VII Алімпіяда беларускай мовы***, прысвечаная 110-й гадавіне з дня нараджэння М. Багдановіча. Вучні пісалі пісьмовыя работы на адну з прапанаваных тэм: «Мой Багдановіч», «Традыцыя і наватарства ў творчасці Максіма Багдановіча».<br>*1. Мароз, А. Пісалі пра Максіма Багдановіча / А. Мароз // Ніва. – 2001. – 11 лют. – С. 5.*<br>*2. Мароз, А. Пад знакам Багдановіча / А. Мароз // Ніва. – 2001. – 18 сак. – С. 1.* |
| **2002** | У ***Ялце,*** у санаторыі «Ялта» адбыўся заключны этап ***фестывалю «Беларусь – мая песня»***, прысвечанага 110-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча, у якім прымалі ўдзел калектывы і выканаўцы беларускіх суполак Феадосіі, Алушты, Еўпаторыі, Сімферопаля, Ялты, Севастопаля.<br>*Жуковский, Г. Ф. Фестиваль «110 лет Максиму Богдановичу» / Г. Ф. Жуковский // Крым. – Беларусь. – 2002. – № 1/2. – С. 22.* |
| **2005** | ***29 лістапада*** ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча адбылася ***навукова-практычная канферэнцыя «Максім Багдановіч – празаік, крытык, публіцыст».***<br>*Максім Багдановіч – празаік, крытык, публіцыст : матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 29 лістапада 2005 года) / [укладальнік І. В. Мышкавец]. – Мінск : РІВШ, 2006. – 124 с.* |
| **2006 (115 гадоў з дня нараджэння** | У Мінскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы будаўнікоў прайшла ***літаратурная вечарына***, прысвечаная 115-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча.<br>*Герасімовіч, В. Незабыўны Максім Багдановіч / В. Герасімовіч //* |

| | |
|---|---|
| **М. Багдановіча)** | *Бібліятэка прапануе. – 2006. – № 5. – С. 13–15.*<br><br>***25 лістапада*** кафедра кампазіцыі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі правяла ***конкурс,*** прысвечаны 115-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча. Удзельнікі конкурсу прадставілі харавы твор для змешанага хору a capella на тэксты Багдановіча.<br>*25 ноября 2006 г. кафедрой композиции проводился конкурс. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.bgam.edu.by/bgam_ru/news_arhiv.htm/* |
| **2008** | На сайце «Архівы Беларусі» прадстаўлены раздзел, прысвечаны М. Багдановічу, які уключае: агульную даведку пра жыццё і творчасць пісьменніка; гісторыю фарміравання збору матэрыялаў сям'і Максіма Багдановіча ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва; пералік архіўных дакументаў са збору матэрыялаў сям'і Максіма Багдановіча ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва.<br>*http://archives.gov.by* |
| **2009** | ***2 жніўня*** ў в. Ракуцёўшчына (Маладзечанскі раён) адбылося ***свята паэзіі і песні «Ракуцёўскае лета – 2009»,*** арганізаванае Маладзечанскім райвыканкамам і Літаратурным музеем Максіма Багдановіча.<br>*Шэлэговіч, Т. Э. Наталіце смагу з Максімавай крынічкі... / Т. Э. Шэлэговіч // Белорусская нива. – 2009. – 1 авг. – С. 11.*<br><br>***У лістападзе*** прайшла ***навукова-практычная канферэнцыя «Максім Багдановіч і сучасны літаратурны працэс»***, прысвечаная 100-годдзю першай публікацыі вершаў паэта.<br><br>***10 снежня*** бібліятэка імя М. Багдановіча правяла ў аграрным ліцэі ***літаратурна-музычны вечар «Нашчадкі песні лебядзінай»,*** прысвечаны 118-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча.<br>*Встреча в лицее [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.smolevichi.minsk-region.by/ru/social_sphere/culture/nov_kult?id=2614* |
| **2010** | У Яраслаўскім гістарычным музеі ў гонар самага маладога і рамантычнага класіка беларускай літаратуры адкрылася ***выстаўка «Геній зямлі беларускай»***, экспанаты для якой прадаставіў Літаратурны музей Максіма Багдановіча (Мінск). Выстаўка прайшла ў рамках Года культуры Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі.<br>*1. Шорец, И. Нежно цветы засветились… / И. Шорец // Народная газета. – 2010. – 2 сн. – С. VI. – (Союзное вече).*<br>*2. Канстанцінскі, М. Сярод цікавых, адметных і значных мерапрыемстваў… / М. Канстанцінскі // Літаратура і мастацтва. – 2011. – 14 студз. – С. 3.*<br><br>***25 ліпеня*** ў філіяле Літаратурнага музея Максіма Багдановіча «Фальварак Ракуцёўшчына» (Маладзечанскі раён) адбылося ***свята паэзіі і песні «Ракуцёўскае лета – 2010»***. У мерапрыемстве ўдзельнічалі паэты В. Шніп і Н. Гальпяровіч, Г. Пашкоў, А. Зэкаў, З. Арцюх і інш., мастак, заслужаны работнік культуры Э. Агуновіч, загадчыца філіяла Літаратурнага музея М. Багдановіча «Беларуская хатка» Т. Лабада, а таксама сябры краязнаўчага клуба «Спадчына» з в. Дварэц Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. |

| | |
|---|---|
| | *Весялуха, М. Максімава свята / М. Весялуха // Літаратура і мастацтва. – 2010. – 30 ліп. – С. 1.*<br><br>***9 снежня*** ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча адбылося ***свята*** з нагоды 119-годдзю з дня нараджэння паэта. У рамках мерапрыемства адкрылася ***выстаўка «Пяць месяцаў з жыцця паэта»***, прайшлі ***музейныя чытанні*** і ***літаратурна музычная імпрэза «Светлыя згадкі»*** з удзелам вядомых беларускіх дзеячаў культуры і мастацтваў.<br>*1. Светлыя згадкі пра Багдановіча // Звязда. – 2010. – 10 сн. – С. 2.*<br>*2. Зорка на небасхіле паэзіі // Народная газета. – 2010. – 10 сн. – С. 3.*<br><br>РУП «Беларускі відэацэнтр» быў зняты ***дакументальны фільм «Максім Багдановіч. Пераадоленне»***. Рэжысёр Мікалай Князеў. Фільм – роздум аб жыцці і творчасці класіка беларускай літаратуры М. Багдановіча. Аўтары распавядаюць аб няпростым лёсе вялікага беларускага паэта праз паказ жыцця нашага суайчынніка – маладога акцёра Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Дзяніса Паршына. |
| **2011 (120 гадоў з дня нараджэння М. Багдановіча)** | ***14 лютага*** Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 187 быў зацверджаны ***план мерапрыемстваў***, прысвечаных 120-годдзю з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча.<br>*1. Галоўка, С. У Ракуцёўшчыну – на «Лета» / С. Галоўка // Мінская праўда. – 2011. – 19 лют. – С. 16.*<br>*2. Как Беларусь отметит 120-летие Максима Богдановича? // Туризм и отдых. – 2011. – 17 февр. – С. 13.*<br>*3. Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 лютага 2011 г. № 187 «Аб мерапрыемствах, прысвечаных 120-годдзю з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча» [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.pravo.by/pdf/2011-22/2011-22(007-028).pdf*<br><br>У ***лютым*** у Музеі Максіма Багдановіча ў Гродне прайшла анімíраваная ***экскурсія «Марыя Апанасаўна запрашае!»***.<br>*Ланская, Ж. Пад гукі фісгармоніі / Ж. Ланская // Гродзенская праўда. – 2011. – 5 лют. – С. 5.*<br><br>***11 сакавіка*** ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча адбылося ***першае пасяджэнне Рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта*** па правядзенню мерапрыемстваў, прысвечаных 120-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча. У пасяджэнні прымалі ўдзел: старшыня Аргкамітэта, Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка, намеснікі міністраў замежных спраў, адукацыі, інфармацыі, сакратар грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі», намеснікі старшынь Мінскага, Брэсцкага і Гродзенскага аблвыканкамаў, а таксама Мінскага гарвыканкама, дырэктар Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.<br>Па выніках пасяджэння прынята рашэнне прапанаваць аблвыканкамам распрацаваць і зацвердзіць рэгіянальныя планы па святкаванню 120-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры.<br>Міністэрства замежных спраў выказала прапанову па стварэнню |

| | |
|---|---|
| | перасоўнай выстаўкі, прысвечанай жыццю і творчасці Максіма Багдановіча з наступным прадстаўленнем у дыпламатычных прадстаўніцтвах Беларусі за мяжой. Саюз пісьменнікаў Беларусі ініцыяваў укараненне ў практыку працы са школьнікамі методыку сумесных сустрэч з пісьменнікамі і супрацоўнікамі музея Багдановіча. Гэтая ініцыятыва была падтрымана Міністэрствам адукацыі.<br>*1. Багдановіч на бігбордах // Культура. – 2011. – 19–25 сак. С. 3.*<br>*2. Нашчадкі ўдзячны за спадчыну // Голас Радзімы. – 2011. – 24 сак.*<br>*3. Габышава, К. Зорка венера ўзыдзе… / К. Габышава // Народная газета. – 2011. – 17 лют. – С. 2.*<br><br>У ***сакавіку*** у Крупскім гісторыка-краязнаўчым музеі (Мінская вобласць) прайшла ***выстаўка ўнікальных дакументаў і фотаздымкаў***, якія распавядаюць пра жыццё і творчасць М. Багдановіча і яго родных. Выстаўка арганізавана<br>супрацоўнікамі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.<br>*Чалей, М. Да юбілею Максіма-кніжніка / М. Чалей / Мінская праўда. – 2011. – 19 сак. – С. 13.*<br><br>***1 красавіка*** адзначыў сваё 30-годдзе Літаратурны музей Максіма Багдановіча. Музеем на гэты год запланавана шмат разнастайных мерапрыемстваў па ўшанаванні вялікага беларускага паэта: новыя выстаўкі, імпрэзы, публікацыі ў газетах і часопісах. Сярод іх і ***конкурс – «Лагатып Літаратурнага музея Максіма Багдановіча».***<br>*1. Музей Максима Богдановича объявляет конкурс на логотип музея [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.ng.by/ru/issues?art_id=55751.*<br>*2. Гладкая, Ю. Идеальный логотип для музея Богдановича / Ю. Гладкая // Знамя юности. – 2011. – 8–14 апр. – С. 29.*<br><br>У ***красавіку*** ў рамках акцыі «Гомель – культурная сталіца СНД 2011 года» стартаваў ***міждзяржаўны прафесійны конкурс бібліятэкараў «Мой Багдановіч»***. Да ўдзелу запрашаюцца маладыя бібліятэкары і чытачы Гомельскай, Бранскай і Чарнігаўскай абласцей.<br>*Конкурс библиотекарей «Мой Богданович» [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.nlb.by/portal/page/portal/*<br><br>***21 мая*** на тэрыторыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту прайшло ***свята «Край беларускі, край самабытны»***, прысвечанае 120-годдзю з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры М. Багдановіча. У канцэртнай праграме прымалі ўдзел фальклорныя калектывы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.<br>*1. Флоренкова, С. Фольклорная суббота / С. Флоренкова // Минский курьер. – 2011. – 20 мая. – С. 32.*<br>*2. Вожык, З. Сапраўдны самабытны край! / З. Вожык // Краязнаўчая газета. – 2011. – Чэрв. (№ 21). – С. 2.*<br><br>***25 мая*** ў Мінску праходзілі мерапрыемствы, прысвечаныя Дню памяці класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча. У скверы каля Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі |

| | |
|---|---|
| | Беларусь прайшла ***літаратурна-музычная імпрэза «Скрозь памяць далёкіх гадоў...»*** з удзелам міністра культуры Рэспублікі Беларусь П. Латушкі, старшыні Беларускага фонду культуры У. Гілепа, пісьменнікаў Н. Гальпяровіча, В. Жуковіча, М. Пазнякова, Л. Рублеўскай, В. Шніпа, дырэктара Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Т. Шаляговіч, музыканта Я. Малішэўскага і іншых дзеячаў культуры, а таксама сяброў патрыятычнага клуба «Спадчына» з в. Дварэц Дзятлаўскага раёна, курсантаў Мінскага суворайскага ваеннага вучылішча, навучэнцаў мінскіх школ і гімназій. Адбылося ***ўскладанне кветак*** да помніка паэту. У Саборы святых апосталаў Пятра і Паўла адбылася ***памінальная служба***. Літаратурны музей Максіма Багдановіча сумесна з салістамі Беларускай дзяржаўнай філармоніі прадставіў ***«Паэтычна-музычную вандроўку ў краіну светлага суму...»***. У гэты дзень можна было бясплатна наведаць экспазіцыі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча і філіяла музея «Фальварак Ракуцёўшчына» ў Маладзечанскім раёне.<br>*1. Цімошык, Л. «У Максіма на кашулі вышыты лісточкі...» / Л. Цімошык // Звязда. – 2011. – 25 мая. – С. 2.*<br>*2. Пра Багдановіча // Культура. – 2011. – 28 мая. – С. 2.*<br>*3. Шэраг мерапрыемстваў, прымеркаваных да Дня памяці Максіма Багдановіча... // Краязнаўчая газета. – 2011. – Чэрв. (№ 21). С. 1.*<br>*4. У Мінску праходзяць мерапрыемствы... [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://news.belta.by/by/news/culture?id=633262*<br><br>На працягу ***мая*** ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча прайшоў шэраг выставак пад назвай ***«Дэманструецца ўпершыню…»***. Экспанаваліся сем тэматычных выставак, якія змянялі адна другую. Спачатку быў прадстаўлены ***«Альбом сям'і Багдановічаў»***, потым былі ***«Перапіска Адама Ягоравіча і Марыі Апанасаўны Багдановічаў»***, ***«Рукапісы Марылькі…»***, ***«Архіў А.Я. Багдановіча – крыніца новых звестак аб жыцці сям'і Багдановічаў у 1910–1940-х гг.»***, ***«Асобнікі «Вянка» М. Багдановіча ў зборы музея, гісторыя кніг»***. Апошнімі прайшлі выстаўкі ***«Рукапісы Максіма Багдановіча»*** і ***«Максіму Багдановічу прысвячаецца»***. Выстаўляліся самыя цікавыя матэрыялы з фондаў музея, якія раней не друкаваліся і не экспанаваліся.<br>*Цягам месяца ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча... // Краязнаўчая газета. – 2011. – Чэрв. (№ 21). – С. 1.*<br><br>У ***маі*** ў рамках Міжнароднага дня музеяў у Музеі Максіма Багдановіча адбыліся мерапрыемствы, прымеркаваныя да 120-годдзя з дня нараджэння паэта. Перад музеем прайшла ***выстаўка-кірмаш народных майстроў «Гродзенскі каларыт»***, ***канцэрт*** з удзелам эстрадных выканаўцаў. У музеі адбылася ***тэатралізаваная экскурсія «Марыя Апанасаўна запрашае!»***, дэманстраваўся ***дакументальны фільм «Максим Богданович. Преодоление»***<br>*Антонова, А. В гостях у Богдановича / А. Антонова // Гродзенская праўда. – 2011. – 21 мая. – С. 12.*<br><br>**28 чэрвеня** ў Палацы Рэспублікі адбыўся ***Рэспубліканскі баль выпускнікоў ВНУ Беларусі,*** прысвечаны 120-годдзю з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча. Выпускнікі прымалі ўдзел у літаратурна-музычнай кампазіцыі, прысвечанай гэтай даце, каля помніка паэту і ва ўрачыстай цырымоніі ўскладання кветак да манумента на плошчы |

| | |
|---|---|
| | Перамогі.<br>*1. Среди гостей – и Максим Богданович*<br>*// Белорусская нива. – 2011. – 29 июня. – С. 1–2.*<br>*2. Команава, Т «Вам пад сілу любыя вышыні...» / Т. Команава // Культура. – 2011. – 2 ліп. – С. 2.*<br><br>***24 ліпеня*** ў філіяле Літаратурнага музея Максіма Багдановіча «Фальварак Ракуцёўшчына» адбылося ***Рэспубліканскае свята паэзіі і песні «Ракуцёўскае лета – 2011»***.<br>У праграме: ***паэтычна-музычная імпрэза*** каля памятных камянёў і ***ўскладанне кветак, знаёмства гасцей*** з філіялам музея «Фальварак Ракуцёўшчына», ***літаратурна-музычная імпрэза***. У свяце прымалі ўдзел Міністр культуры Рэспублікі Беларусь П. Латушка, намеснік міністра культуры Т. Стружэцкі, беларускія пісьменнікі, музыканты, фольк-медыя гурт «Неруш», ансамбль «Талака». Рэдактар канала «Культура» Беларускага радыё, рэжысёр народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова» У. Трапянок сыграў ролю Максіма. Важнай падзеяй стала святкаванне 100-годдзя з дня прыезду М. Багдановіча ў Беларусь.<br>*1. Чайкоўская, В. Прысутнасць Максіма / В. Чайкоўская // Звязда. – 2011. – 21 ліп. – С. 2.*<br>*2. Старонка ў штодзённіку: двайны юбілей «Ракуцёўскага лета» // Культура. – 2011. – 23 ліп. – С. 14.*<br>*3. Духовіч, А. Зорка Максіма над Ракуцёўшчынай / А. Духовіч // Мінская праўда. – 2011. – 26 ліп. – С. 2.*<br>*4. Масляніцына, І. Сто гадоў таму ў Ракуцёўшчыне… / І. Масляніцына // Літаратура і мастацтва. – 2011. – 29 ліп. –С. 1.*<br>*5. Пякарская, Н. Ураджай з «Максімавага сада» / Н. Пякарская // Культура. – 2011. – 30 ліп. – С. 3.*<br><br>У верасні Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі выдадзены мультымедыйны праект (DVD-ROM) ***«Паэт красы і гармоніі»: да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча (1891–1917)».***<br><br>У ***верасні*** ў выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» плануецца ***выпуск энцыклапедыі «Максім Багдановіч»***, прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння беларускага класіка.<br>*1. Чайкоўская, В. Персанальны Багдановіч / В. Чайкоўская // Звязда. – 2011. – 20 крас. – С. 3.*<br>2. Иванова, Л. Стратим-лебедь в формате вечности / Л. Иванова // Советская Белоруссия. – 2011. – 29 апр. – С. 8.<br>*3. Чарнякевіч, Ц. На шляху да падагульнення / Ц. Чарнякевіч // Літаратура і мастацтва. – 2011. – 6 мая. – С. 7.* |